ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 9(1022) | ЧАЦВЕР, 16 мая 2002 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ДЭКАДА ДЗЁН СВЯТОЧНЫХ

Надзвычай насычанай на святочныя дні была сёлета першая дэкада бягучага месяца. 1-га мая ўрачыста адзначалася традыцыйнае веснавое свята Працы. У гарадской дэманстрацыі прайшла і калона нашага універсітэта. А яго рэктар прафесар, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь М.В.Селькін выступіў з трыбуны Цэнтральнай плошчы імя У.І.Леніна перад удзельнікамі мітынгу.

На першую майскую нядзелю выпала самае вялікае праваслаўнае свята – Вялікдзень. Яно супала з Днём друку. Услед за журналістамі сваё прафесіянальнае свята адзначылі работнікі радыё, тэлебачання і сувязі.

Самай жа важнай і знамянальнай, бадай, для кожнага з нас стала дата 9-га мая – Дзень Перамогі. Як і ў папярэднія гады, гэтае свята прайшло пад знакам глыбокай памяці і вялікай удзячнасці абаронцам Радзімы, загінуўшым і жывым, хто каваў Перамогу на франтах, у падполлі, партызанскіх атрадах і самаадданай працай у тыле краіны.

У гонар 57-й гадавіны Вялікай Перамогі ва універсітэце адбыліся сустрэчы студэнтаў з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Шаноўнымі гасцямі будучых маладых спецыялістаў і іх настаўнікамі былі палкоўнікі ў адстаўцы К.М.Карасёў, А.А.Косцікаў, В.В.Крывіч, К.С.Чугроў і іншыя змагары за нашы светлыя мірныя дні.

7-га мая для членаў ветэранскай арганізацыі нашага універсітэта быў наладжаны святочны "агеньчык". Перад яго пачаткам былыя воіны і народных мсціўцы прыйшлі да брацкай магілы ў студэнцкім парку. Тут адбыўся мітынг. Перад прысутнымі выступілі старшыня Савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, Узброеных Сіл і працы палкоўнік у адстаўцы А.А.Косцікаў і старшыня пярвічнай арганізацыі БПСМ ГДУ І.Казакоў. Мінутай маўчання ўдзельнікі мітынгу ўшанавалі памяць загінуўшых і ўсклалі на іх магілу вянок і кветкі.

На святочным "агеньчыку" за актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні студэнтаў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны прафесару кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін А.С.Калугіну, Г.С.Еўдакіменку, палкоўнікам у адстаўцы А.А.Косцікаву, М.П.Шкарбуну, падпалкоўніку ў адстаўцы Р.С.Мільчанку ўручаны Ганаровыя граматы і памятныя значкі універсітэта.

Усім ветэранам універсітэцкай арганізацыі – удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны аказана матэрыяльная дапамога. У іх адрас прагучалі цёплыя ўдзячныя словы і пажаданні на будучыню ад імя рэктарата і грамадскіх арганізацый універсітэта, асобных удзельнікаў святочнай вечарыны.

Прадстаўнікі ўсіх факультэтаў і структурных падраздзяленняў універсітэта 9-га мая прынялі ўдзел у агульнагарадскім святкаванні дня Вялікай Перамогі.

## ВЫЗНАЧАНЫ ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ

23 красавіка конкурсная камісія універсітэта разгледзела навуковыя працы, прадстаўленыя на традыцыйны штогадовы конкурс "Скарынаўскія чытанні". Пасля іх усебаковага абмеркавання лепшымі прызнаны пяць. Гэта работы кандыдатаў навук, дацэнтаў І.М.Афанасьева – з кафедры рускай літаратуры, Г.В.Гатальскай – загадчыка кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі, Л.М.Крывашэевай – з кафедры эканамічных тэорый, Р.Р.Лазько – з кафедры ўсеагульнай гісторыі, Г.І.Нарскіна – з кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры.

Конкурсная камісія рэкамендавала Савету універсітэта прызнаць пераможцамі конкурсу на лепшыя навукова-даследчыя работы 2002 года вышэйназваных вучоных; прадставіць аўтараў да ўзнагароджання і прысвоення ганаровага звання "Лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў". Рашэнне конкурснай камісіі было зацверджана 26 красавіка на пасяджэнні Савета універсітэта.

"Скарынаўскія чытанні" адбудуцца на пасяджэнні Савета ГДУ ў апошні чацвер мая.

## АЛІМПІЯДА ВЫЗНАЧЫЛА ЛЕПШЫХ

Завяршылася універсітэцкая алімпіяда па англійскай мове сярод студэнтаў негуманітарных факультэтаў. У ёй прынялі ўдзел 30 юнакоў і дзяўчат, якія спрабавалі свае сілы ў такіх конкурсных заданнях, як аўдзіраванне, граматычны тэст, гутарка па вуснай тэме.

Выпрабаванне праходзіла ў два патокі. У першым з іх члены журы аддалі пальму першынства Вользе Плотнікавай і Ірыне Мігас, студэнткам першага курса эканамічнага факультэта. Другое месца занялі Мікалай Маркараў (1 курс, эканомфак) і студэнтка матфака Юлія Летуновіч, трэцяе – Вячаслаў Красноў (1 курс, фізічны факультэт), Кацярына Кірпічэнка, Станіслава Папкова – першакурснікі эканомфака. У другім патоку тры прызавыя месцы аддадзены адпаведна Наталлі Прыкота, Алене Прывалавай з юрыдычнага факультэта і Дар'і Сіманчук з эканомфака.

Віншуем пераможцаў!

**Л.КУЗЬМІНЫХ, выкладчык кафедры англійскай мовы.**



**Пяцікурсніца матфака Таццяна Вадап'янава атрымала сёлета накіраванне на працу ў адну з сярэдніх школ г.Гомеля. Дзяўчына прыйдзе ў клас з багатым багажом ведаў, бо ў час вучобы зарэкамендавала сябе здольнай і старанней студэнткай.**

**Фота У.Чысціка.**

## АБ СТУДЭНЦКАЙ ПРАФСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

16 мая ў аўдыторыі 2-26 пятага вучэбнага корпуса адбудзецца справаздачная канферэнцыя пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў універсітэта. Ёй папярэднічалі справаздачна-выбарныя сходы ў акадэмічных групах і канферэнцыі на факультэтах.

Дэлегаты абмяркуюць дзейнасць прафкама студэнтаў за 2000-2001 гады і заключаць Пагадненне паміж рэктаратам і калектывам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях на 2002-2003 гады.

Пачатак канферэнцыі – у 12.00.

**ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі **ХАРЛАМАВА Валянціна Іванаўна** і асістэнт кафедры хіміі **БЯЛЯЕВА Людміла Мікалаеўна.**

* * *

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны доктар фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі **МІРОЦІН Адольф Рувімавіч.**

* * *

За шматгадовую добрасумленную і плённую працу, высокія вытворчыя дасягненні ў рабоце Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана малодшы навуковы супрацоўнік НДС **ЦІТОВА Нэллі Мікалаеўна.**

## ДА ДАСКАНАЛАСЦІ – ПРАЗ ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Наш універсітэт нядаўна наведалі госці з далёкага замежжа. Прадстаўнікі амерыканскай моладзі, удзельнікі студэнцкага хрысціянскага руху, які зараз атрымаў шырокае развіццё ва ўсім свеце, сустракаліся са студэнтамі ГДУ, пабывалі ў інтэрнатах, дзе правялі анкетаванне сярод моладзі.

– Студэнцкі хрысціянскі рух ставіць высакародныя мэты: праз хрысціянскія каштоўнасці – веру ў дабро, у Бога, любоў да людзей удасканальваць духоўны свет чалавека, – растлумачыла Алена Сапрыкіна, непасрэдная яго ўдзельніца, выпускніца Беларускага лінгвістычнага універсітэта і завочнага факультэта ГДУ. – Сучасная моладзь страчвае правільныя арыенціры ў жыцці, нярэдка аддаючы перавагу наркотыкам, алкаголю, іншым адмоўным з'явам. Ёй трэба дапамагчы ў пошуках дастойнай мэты, і гэта магчыма праз абсалютныя каштоўнасці, якія закладзены ў хрысціянстве. Гэта ўдзельнікі названага руху і спрабуюць данесці да свядомасці моладзі. Яны могуць таксама параіць, як знайсці сапраўдных сяброў, правільна будаваць свае адносіны з людзьмі, вырашаць узнікаючыя паміж імі канфлікты і г.д. А непасрэдныя зносіны з замежнай моладдзю – яшчэ і выдатная школа для нашых студэнтаў ва ўдасканальванні валодання англійскай мовы.

Гэта непасрэдна на сабе зведалі будучыя біёлагі, якія вывучаюць англійскую мову, у час сустрэчы са сваімі замежнымі гасцямі ў адной з факультэцкіх аўдыторый. Вось якія ўражанні засталіся ў іх пасля гэтага:

– Наша знаёмства праходзіла ў форме гульні, у якую нам прапанавалі згуляць нашы новыя знаёмыя. Яны расказалі нам пра сябе, свае сем'і, затым мы ўсе зрабілі тое ж самае. Далей размова пайшла аб культуры. Мы разам прыйшлі да высновы, што ў нас, у народаў нашых і іх краін у культуры агульнае, а што – рознае. У ходзе гульні яны пазнаёмілі нас з выдатнымі асобамі сваёй краіны, а мы, у сваю чаргу, зрабілі тое ж самае.

Урыўкам з "Біблії" мы "пераключыліся" на рэлігійную тэму. Мы адкрылі для сябе, што Бога неабходна любіць розумам і сэрцам, з іх размовы зразумелі таксама, што Бог дапамагае ім настолькі, наколькі яны вераць у яго: гэта вера вельмі моцная.

Сустрэча паказала таксама, наколькі вялікае значэнне маюць зносіны з жыхарамі замежных дзяржаў у вывучэнні англійскай мовы. Мы спадзяемся, што гэта сустрэча была не адзінай, і нам зноў прадставіцца магчымасць убачыцца з імі. Мы падзякавалі нашых новых знаёмых і зрабілі агульны фотаздымак на памяць.

Аб наладжванні ўзаемнага супрацоўніцтва адбылася размова замежных гасцей з загадчыкам кафедры сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі дацэнтам Г.В.Гатальскай. І гэта не выпадкова, бо псіхалогія ставіць такія ж агульначалавечыя мэты, як і міжнародны студэнцкі рух. Формамі іх дзеляных адносін могуць стаць абмен спецыяльнай навуковай літаратурай, наладжванне сумесных канферэнцый, правядзенне заняткаў са студэнтамі па развіцці экзістэнцыяльных каштоўнасцей.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## НАЗНАЧАНЫ НАМЕСНІКАМ ДЭКАНА

Загадам па універсітэту намеснікам дэкана геолага-геаграфічнага факультэта назначаны кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў **ГУСЕЎ Андрэй Пятровіч.**

## НОВЫ АДДЗЕЛ

Ва універсітэце створаны новы аддзел – па ахове працы і тэхніцы бяспекі. Яго начальнікам назначаны **НОВІКАЎ Мікалай Сцяпанавіч.**

## ПОДГОТОВКУ СПЕЦИАЛИСТОВ – НА МИРОВОЙ УРОВЕНЬ

В конце апреля состоялась традиционная внутриуниверситетская конференция "Актуальные вопросы научно-методической работы". Ученые, преподаватели, аспиранты представили 120 докладов, содержащих научные, практические, методологические изыскания.

Работу конференции открыл ректор профессор М.В.Селькин. В приветственном слове Михаил Васильевич от имени всего ректорского корпуса поздравил собравшихся с этим значимым событием в жизни нашего вуза.

В докладе проректора по учебной работе, председателя НМС университета, профессора С.Ф.Каморникова "О перспективах развития обучающе-исследовательского принципа в университете" подняты вопросы, касающиеся новой парадигмы в системе образования. Основной целью педагогов высшей школы в настоящее время должна стать разработка новых моделей обучения молодежи, способной не только воспринимать и передавать фундаментальные знания, но и решать принципиально новые задачи, которые ставит перед обществом жизнь.

С.Ф.Каморников отметил основные перспективы развития обучающе-исследовательского принципа как приоритетного направления в ГГУ в связи с переходом к многоступенчатой системе обучения.

На пленарном заседании с докладами выступили ведущий инженер НИРС А.В.Гаев ("НИРС: формы, опыт, перспективы развития") и доцент кафедры МПУ М.С.Долинский ("Применение и перспективы инструментальной системы дистанционного обучения, разработанной в ГГУ им.Ф.Скорины").

Важнейшие направления и самые спорные вопросы, сопутствующие инновационным проектам в системе научно-исследовательской работы со студенческой молодежью, рассматривались в ходе работы 4-х секций по основным тематическим направлениям.

Участники секционных заседаний обсудили насущно важные вопросы формирования исследовательской деятельности студентов в процессе их обучения, принципы использования новых научно-методических технологий; выдвинули конкретные предложения для успешной реализации мероприятий, намеченных Минобразованием РБ и ректоратом ГГУ.

Ректорат совместно с оргкомитетом конференции по результатам ее работы принял резолюцию.

**Т.АВДОНИНА,**
**доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**

## ПРАЗДНИК ТЕХНИЧЕСКОГО ТВОРЧЕСТВА



На базе физического факультета уже в третий раз прошёл традиционный конкурс по техническому творчеству среди учащихся Гомельской области, так как только в нашем университете имеется специальность "Физика и техническое творчество" и реально выполняются пункты "Договора о сотрудничестве" между областным Центром технического творчества учащихся (ОЦТТУ) и ГГУ им. Ф.Скорины. Структура конкурса каждый год совершенствуется, приближаясь по своему уровню к областным предметным олимпиадам.

Конкурс проводится в два тура. Первый из них – научно-практическая конференция – уже утвердился по направлениям, и, соответственно, секциям. Их три: "Моделирование и конструирование" (М), "Электронная схемотехника" (Э), "Физический эксперимент и компьютерное моделирование" (Ф). На секциях обсуждаются доклады участников, которые, как правило, сопровождаются натурной демонстрацией разработок и оцениваются компетентным жюри по тридцатибальной системе.

Второй тур – теоретический. Это решение физических задач с техническим содержанием. Стоит сказать об эволюции этой номинации конкурса. На конкурсе 2000 года условия задач предлагались заранее, и участники представляли их "домашние" решения. На конкурсе 2001 года участникам "уже на месте" были предложены 15 задач с указанным рейтингом, решения трех из которых по выбору или за счёт теоретического тура. На конкурсе 2002 года для теоретического тура были составлены четыре группы задач разного уровня сложности, соответственно 11-, 10-, 9-классников и младшей группы (7-8 классы). Решение каждой задачи оценивалось из десяти баллов, и любой участник мог теоретически набрать 30 баллов. Командный зачёт подводился по сумме баллов, набранных членами команды в обоих турах конкурса. Его лауреаты в личном зачёте определялись по каждой секции конференции и по теоретическому туру (1,2,3 места), и награждались ценными призами и дипломами. Так же были предусмотрены три диплома для победителей конкурса по сумме баллов двух туров. Вполне естественно, что эти победители должны определяться только "в самой тяжёлой весовой категории" – среди 11-классников, решавших самые трудные задачи теоретического тура. Именно для выпускников школ, победителей данного конкурса, предусмотрены льготы (оценка "5" по физике) при поступлении в Гомельский госуниверситет на специальность "Физика и техническое творчество" (ФТТ).

В целом конкурс удался и явился настоящим праздником технического творчества для ребят, представлявших большинство районов Гомельской области.

Большая работа была проведена конкурсным жюри под председательством профессора И.В.Семченко при подготовке и проверке задач (В.И.Кондратенко, В.Ф.Шолох, автор этих строк) и в проведении конференции.

В секции "Моделирование и конструирование" (члены жюри – В.О.Замятнин, В.И.Кондратенко, Н.А.Матвеичев) с интереснейшим докладом "Теоретический экскурс изготовления модели" выступил 10-классник из Речицы Геннадий Сыч (кстати, его научным руководителем был студент 3-го курса специальности "Физика и техническое творчество" Дмитрий Дроздов). Оригинальная и полезная работа учащегося 10 класса СШ №30 г.Гомеля Андрея Побияха "Шлифовально-полировальный станок", брат которого Александр Побияха был победителем прошлогоднего конкурса, а ныне он студент 1-го курса ФТТ. Уже используются в хозяйстве разработки 9-классников из Петрикова Виталия Дроздова ("Мельница роторная универсальная") и Александра Штыкова ("Цепная электрическая пила").

В секции "Электронная схемотехника" (члены жюри – ветеран технического творчества Светлана Георгиевна Богданович, заведующий отделом научно-технического творчества, выпускник специальности ФТТ 2000 года О.Н.Ходосок, автор этих строк), где было представлено 11 докладов, плотность результатов наиболее высокая. Интеллект и техническую грамотность в электронике с разработкой "Радиокассета" проявил 11-классник из г.Мозыря Валерий Руденя, ставший абсолютным победителем конкурса по сумме баллов в двух турах. Всего на один балл отстал 9-классник СШ №40 г.Гомеля Алексей Стенюхин с "солидной" конструкцией "УКВ-приёмник". И ещё один балл отделил 11-классника из Рогачёва Александра Сапатькова, представлявшего полезную технологическую разработку "Диагностический стенд электронного зажигания". Следует отметить "самого юного ветерана конкурса", уже принимавшего участие в конкурсе прошлого года, 8-классника из Светлогорска Владимира Жигунова с его разработкой "Измеритель ёмкости", а также работы ребят из Лоева и Добруша. В проведении работы секции помощь жюри оказали студенты 3-го курса ФТТ, члены творческого клуба "Электроника" Алексей Бредихин, Павел Бордак, Алексей Седой, а "поболеть" за ребят пришёл победитель конкурса прошлого года, студент 1-го курса ФТТ Сергей Барсуков.

В секции "Физический эксперимент и компьютерное моделирование" (жюри – И.В.Семченко, С.А.Хахомов, В.Ф.Шолох) выделялась работа 10-классника из Житковичского района Антона Сургуладзе "Тележка для демонстрации превращения энергии из одного вида в другой". Достойную оценку получила полезная для школ "Обучающая программа по геометрии" 11-классника из Рогачёва Сергея Коновальчика. Порадовала жюри "Программой по обработке наблюдений метеоров" 9-классница СШ №22 Гомеля Кристина Карчевская. Достаточно интересными были и другие доклады участников секции. Помощь жюри в работе секции оказали аспирант, выпускник специальности ФТТ 2001 года Андрей Коробкин и студент 5-го курса Юрий Железняков.

Показательны итоги командной борьбы. Очень ровно во всех турах выступила интеллектуальная команда г.Мозыря, уверенно занявшая первое место. Несколько неудачное выступление в теоретическом туре вывело "лишь" на третье место победителя прошлогоднего конкурса команду Рогачёвского района. Надо отметить, что Рогачёвский центр технического творчества учащихся проводит районные конкурсы по техническому творчеству и успешное стабильное выступление команды вполне закономерно. Порадовала перспективная команда 9-классников ОЦТТУ, достойно занявшая второе место. И можно уверенно прогнозировать будущие успехи юной команды Светлогорского района.

В конкурсе есть победители, но нет побежденных. Основным его итогом является радость общения единомышленников как юных, так и взрослых. Несомненно, следует отметить большую работу сотрудников ОЦТТУ, обеспечившим приезжим участникам конкурса питание, проживание, транспорт. Ценные призы победителям и культурную программу организовали отдел по делам молодёжи Управления образования облисполкома (В.А.Санчук), областное отделение "Белорусский фонд мира" (Т.И.Глушаков), областное общественное объединение "Белорусский патриотический союз молодежи" (Т.Потеряйло).

На заключительном заседании конкурсного жюри прозвучала ценная идея – расширить ареал конкурса на соседние области братских стран. Нам это по силам – опыт есть, недостатки устранимы.

**И.ЯКОВЦОВ,**
**старший преподаватель кафедры общей физики.**

СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ

## СИЛА СОДРУЖЕСТВА

***9 мая в очередной раз на всей территории бывшего СССР и в странах зарубежья широко отмечалась 57-я годовщина Великой Победы. Она стала достижимой благодаря героизму и сплоченности многих народов. Неоценимый вклад в разгром врага внесли и народные мстители. Об их подвиге рассказывается в публикуемом ниже архивном материале.***

Мощь дружбы братских народов трех соседствующих областей – Брянской, Гомельской, Черниговской – проявилась в совместной партизанской борьбе против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны.

На оккупированной территории названных областей разгорелась подпольная борьба против вероломного врага. Осенью 1943 года на Гомельщине вели борьбу 29 бригад (они объединяли 117 отрядов) и более десяти отдельно действующих отрядов. С врагом сражалось около 50 тысяч человек. Более 50 тысяч человек боролись с оккупантами в партизанских отрядах и подполье на Черниговщине и более 60 тысяч – на Брянщине.

Народные мстители трех соседних областей в тесном боевом содружестве героически сражались в тылу врага, оказывали друг другу взаимную помощь боеприпасами, продовольствием, информацией о противнике. Немало совместных боевых операций провели они по разгрому вражеских гарнизонов и железнодорожных коммуникаций.

Так, комиссар Ельского партизанского отряда Зусь Яковлевич Черноглаз в отчете Белорусскому штабу партизанского движения сообщал следующее о проведении совместной боевой операции с бойцами украинского отряда соединения С.А.Ковпака: "... 23 декабря 1942 г. южнее деревни Глушковичи Лельчицкого района Полесской области наш отряд совместно с двумя ротами 3-го батальона отряда тов. Ковпака принял бой с немцами.

Немцы силой до батальона окопались в лесу. Бой длился 4 часа. По своей силе и характеру это был один из сильнейших боев, в котором принимали участие партизаны нашего отряда. В этом бою только на нашем участке боя убито 85 немецких солдат".

А газета "Большевик", орган Черниговского обкома партии, 28 июня 1943 года сообщала: "Партизаны Черниговской, Киевской, Житомирской, Ровенской, Запорожской, Гомельской, Минской, Орловской областей и крымские партизаны за один день пустили под откос 12 немецких эшелонов, бронепоезд, взорвали 4 железнодорожных моста, совершили налет на 3 железнодорожные станции, разрушили все железнодорожные сооружения, разгромили 7 немецких гарнизонов и 5 комендатур, уничтожили 850 гитлеровцев".

Действия партизан были тесно связаны с наступательными операциями Красной Армии. Так, в период битвы за Сталинград в Брянских лесах были проведены рейды соединений под командованием С.А.Ковпака и А.Н.Сабурова на Правобережную Украину и Белоруссию. 26 октября 1942 года эти соединения одновременно выступили из южного массива Брянских лесов. За 14 дней они прошли более 300 километров – по Брянщине и Черниговщине. 7 ноября соединения с боями переправились через Днепр в район г.Лоева и вступили на территорию Белорусского Полесья. Эти рейды сыграли большую роль в укреплении боевого содружества русского, украинского и белорусского народов в совместной борьбе с врагом.

**В.ЛУГОВСКАЯ,**
**зав. отделом Гомельского облгосархива.**

Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**

праектаў фундаментальных даследаванняў "НАВУКА 2003". Заяўка на конкурс уносіцца па ўстаноўленых формах да 20 мая. Формы заяўкі знаходзяцца ў аддзеле НТІ (гал. корп., ауд. 5-6, тэл. 57-34-12).

## РАСТУЦЬ РАДЫ ВУЧОНЫХ-ЭКАНАМІСТАЎ

Пайшоў трэці год, як пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны быў адкрыты спецыялізаваны Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па эканамічных навуках. Яго ўзначаліў доктар эканамічных навук, прафесар кафедры эканамічных тэорый ГДУ М.В.Навучыцель. Пад старшынствам гэтага шырока вядомага вучонага Савет працуе даволі прадуктыўна. Калі ў 2000 годзе на яго пасяджэннях было абаронена 6 кандыдацкіх дысертацый, летась – 8, дык чакаецца, што сёлета запаветную мару на атрыманне вучонай ступені здзейсняць каля 12 саіскальнікаў. Трое з іх ужо дасягнулі пастаўленай мэты напярэдадні першамайскага свята. Гэта выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога, Магілёўскага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта і Беларускага гандлёва-эканамічнага універсітэта спажывецкай кааперацыі адпаведна Л.А.Лапіцкая, Г.М.Плаксіна, С.П.Гурская.

Заўважым, што за час існавання названага Савета з 17 абароненых кандыдацкіх дысертацый 8 належаць выкладчыкам Беларускага гандлёва-эканамічнага універсітэта спажывецкай кааперацыі.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

По мележаўскіх мясцінах

# ТАМ ПОДЫХ ГІСТОРЫІ ЧУВАЦЬ...

Час неад'емна разбурае тое, што стваралася дзесяцігоддзямі, але яму не пад сілу знішчыць той найвялікшы скарб, які пакінуў пасля сябе народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ.

У гэтым пераканаліся студэнты-філолагі падчас экскурсіі па родных мясцінах таленавітага мастака. Безумоўна, час паклаў на іх свой адбітак, але ўсе ж такі яны захавалі подых гісторыі.

Перш-наперш, мы наведалі месца, з апісання якога пачынаецца раман "Людзі на балоце", – гэта вёска Курані (на жаль, засталося толькі некалькі хат – зараз там чарнобыльская зона). Прыгадаліся радкі з рамана: "Вёска Курані стаяла сярод балот, як на востраве, большую частку года адрэзаная ад усяго свету..." Зараз ужо няма ніякага балота, а толькі засталася грэбля, якую так старанна будаваў Міканор у рамане. Знайшлі мы і грушу-дзічку, пад кронай якой сустракаліся Васіль і Ганна і марылі пра сваё далейшае жыццё.

Пасля вёскі Курані паехалі ў Глінішча – месца, дзе і нарадзіўся І.Мележ. Там наведалі музей, у якім даведаліся больш падрабязна пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка і нават факты, што дагэтуль не былі нам вядомы.

Некалькі слоў трэба сказаць пра гісторыю напісання рамана "Палеская хроніка", пра якую нагадаў у музеі. Спачатку была задумка "напісаць аповесць пра Палессе, ... пра барацьбу палешукоў з прыродай у пасляваенны час". У 1956 г. пісьменнік ужо бачыў у сваім уяўленні не аповесць, а "раман аб простых людзях беларускага Палесся". Ажыла ў творы не сучаснасць, а рэчаіснасць 20-х гадоў. Большасць герояў яго хронікі не выдумана, не створана мастацкай фантазіяй, а ўзята з жыцця, таму старонкі рамана такія непаўторныя, жывыя і запамінальныя. І гэта сапраўды так, бо мы наведалі, напрыклад, хату, дзе жыў Міканор з жонкай (менавіта з яго і маляваўся вобраз героя рамана).

Напісаўшы ў 1960 г. "Людзі на балоце", І.Мележ зразумеў, што сказаў у рамане не ўсё, што жыло ў душы. У 1965 г. з'явіўся "Подых навальніцы". "Я не мог – рана ці позна – не напісаць гэтыя раманы – "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы", – бо насіў іх у сабе як радасць і пакуты доўгія гады... Родная вёска, людзі, маё юнацтва – усё гэта жыло ў маім сэрцы і не давала спакою", – гаварыў І.Мележ у адным з інтэрв'ю.

У 1976 г. з'явіўся раман "Завеі, снежань". У архіве пісьменніка засталіся накіды, планы, асобныя сцэны і гатовыя раздзелы яшчэ двух раманаў "Палескай хронікі" – "За асакою бераг" і "Праўда вясны". У іх І.Мележ хацеў расказаць пра жыццё дарагіх яму людзей у 30-я і 40-я ваенныя гады.

Наведаўшы родныя мясціны пісьменніка, мы ўсе пранікліся духам гісторыі, духам таго жыцця...

**Алеся РАДНЯНКОВА,**
**студэнтка гр. БА-33 філалагічнага факультэта.**

# СВЯТА ФАКУЛЬТЭТА

Добрай традыцыяй для філолагаў ГДУ стала правядзенне "Дзён факультэта".

Тыдзень студэнцкай навукі адкрыла пленарнае пасяджэнне, на якім удзельнікаў канферэнцыі вітаў дэкан філфака дацэнт У.А.Бобрык. Ён зрабіў спраздачу аб навуковай рабоце на факультэце і пажадаў усім пачынаючым даследчыкам вялікіх адкрыццяў і перамог.

Студэнты адказна аднесліся да ўдзелу ў рабоце навуковых секцый па мове і літаратуры. На кожнай з іх вяліся ажыўленыя дыскусіі і ўносіліся новыя прапановы. Студэнцкія работы былі высока ацэнены і яшчэ раз пацвердзілі трывалую навуковую базу філалагічнага факультэта.

Ва ўнісон "Дням філфака" ў адзін з красавіцкіх дзён сумесна з кіраўніцтвам спецыялізаванай славянскай бібліятэкі і Таварыствам Кірылы Тураўскага кафедра рускай літаратуры на чале з дацэнтам Л.Л.Ермаковай арганізавала навукова-асветніцкую сустрэчу "М.В.Гогаль і сучаснасць", прысвечаную 150-годдзю з дня смерці вялікага пісьменніка. Ва ўтульнай зале славянскай бібліятэкі сабраліся студэнты, выкладчыкі, творчая эліта і прадстаўнікі грамадскасці г.Гомеля, каб пагаварыць аб жыцці і творчай спадчыне геніяльнага мастака слова.

Тыдзень факультэта завяршыўся святочным канцэртам, на якім парадавала сваім выступленнем студэнтка Ганна Чумакова. Яна выканала пад гітару сваю ўласную песню. Унеслі ажыўленне і прыўзнялі настрой танцоўшчыцы з гарадскога калектыву "Пад сузор'ем Дзевы". Дыскатэка стала лагічным завяршэннем свята.

**Тацццяна ЦЕЛЯХОВІЧ,**
**студэнтка гр.РБ-43 філфака.**



# ЗА СЛОВОМ В КАРМАН НЕ ЛЕЗЛИ

В гостях нашего университета побывал литературно-народный театр "Живое слово" Белорусского государственного педагогического университета им. М.Танка. В труппе несколько десятков человек, и они показали зрителям миниатюры, пародии, сценки из студенческой жизни, интерпретированные сказки, юморески, вокальные номера под аккомпанемент гитар. В своем творчестве студенты использовали в основном слово, а вместо костюмирования, зачастую, какую-нибудь броскую деталь: например, головной убор, украшение, предмет в руках. В общем, за словом в карман не лезли. Затруднения с речью возникали только у персонажей отдельных сюжетов, где по сценарию высмеивался какой-нибудь "тюфяк", не умеющий связать и двух слов.

Играли ребята живо, задорно, страстно, что присуще молодым (ведь все актеры – студенты). У пробивающегося мастерства основательные корни – театр был создан А.А.Колядой еще 36 лет назад. Ныне – уже 11 лет кряду – марку коллектива поддерживает режиссер Ю.В.Гаренко. Происходившее на сцене очень увлекало. В полуторачасовые временные рамки зрелища вошли диалоги "Он и Она" (о любви, конечно), зарисовки из студенческих будней (дважды о любви), сценки под названием "игры во взрослых" с хорошим чувством юмора, который тут же оценивался всеобщим хохотом, а еще импровизации по произведениям Мольера. Завершение этих маленьких спектаклей превратилось в овацию вставших со своих мест немногочисленных (а жаль!) зрителей. И вот еще что: обусловлено ли это было миниатюрной сценой выставочного зала, полутораметровым расстоянием от возвышения (где шла игра) до первого зрительского ряда, или еще чем – осталось загадкой, но иногда, щедрые на интонации слова актеров казались стремительными стрижами, которые устанавливали молниеносный контакт с аудиторией.

Наверное, название театра обязывало.

**В.ЧИСТИК.**

**НА ФОТО: (слева направо): Сергей Яблонский и Алексей Шиманович показывают фирменную живословную сказку.**
**Фото автора.**

# «НЕ ПРОСТО МЫСЛИТЬ, НО МЫСЛИТЬ ХОРОШО»



*"Люди счастливы настолько, насколько сами решили такими быть"*

(Линкольн)

**Особенность нашего менталитета такова, что мы изначально направлены на неудачу. Вместо того, чтобы конструктивно решать проблемы, мы избегаем их, прячемся: "авось минет". Но жизнь не бывает однородной и на смену радостям, как правило, приходят огорчения. И вот тут то мы и прячем голову в песок. Почему так происходит?**

Каждый из нас – выходец из своего окружения. Любое событие оставляет след в нашем сознании. Механизм его образования напоминает действие магнитофона, так как запечатленные образы все время проигрываются в мозгу. Все вы наверняка помните, что говорили наши заботливые родители: «Не делай этого – у тебя все равно ничего не получится», «даже и не думай – тебе это не по зубам». Казалось бы, это просто слова, но слово, во-первых, является тем фундаментом, на котором вырастает сознание, мышление и личность человека; во-вторых, слово является каркасом, на котором строятся отношения между людьми. Именно так и складывается наш привычный способ решения проблем – уход от них. Мы закрываем глаза на необходимость решения неприятных нам задач, поджидая другого удобного случая и надеясь на то, что все как-нибудь «рассосется». Проходят дни, месяцы и годы, а мы так и стоим на месте, не замечая, что жизнь течет как песок сквозь пальцы.

Таким образом, все мы играем роль неудачников, доставшуюся нам еще в детстве «благодаря» неусыпному контролю родителей, нескончаемому бдению и бесконечной заботе. Наши внутренние образы привязывают нас к этой вредной привычке, которая расходится с нашими истинными интересами.

Большинство людей считают мышление процессом непроизвольным, и поэтому убеждены, что невозможно перестать думать по собственному желанию. Ничего подобного! Даже самые навязчивые мысли можно подавить и изменить. И уж тем более можно бороться с бесконечной «формулой неудачи», преследующей нас с детства. Как?

**Никогда не говорить себе «не могу»**, ибо шансы, что вы действительно не сможете, возрастают в геометрической прогрессии. Дело в том, что наш внутренний разум несколько глуп и всю поступающую извне информацию воспринимает буквально. Например, безобиднейшая фраза: «Я просто с ума схожу!» – слышится моему разуму признанием в утрате рассудка. Кстати, ваш разум поймет эту фразу так же. Отвечая на вопрос: «Не скажите ли вы мне, где вы родились?» – бодрствующий человек почти наверняка назовет место своего рождения. Находясь под гипнозом, он скажет: «да», или просто кивнет головой – это и будет точным ответом на буквально поставленный вопрос.

С другой стороны, если вы утверждаете обратное – «я могу» или «я сделаю» – вероятность успеха значительно возрастет, поскольку мысль предопределяет действия.

**Потенциал человека безграничен, возможности – неисчерпаемы.** Поэтому относитесь к себе как к уникальному, бесценному сознанию, аналогов которому в мире нет! Вы наделены всем необходимым, чтобы выжить и преодолеть любые проблемы. Думайте о том, что вы можете сделать, забудьте о том, чего не в силах добиться. На этот счет есть классное упражнение. Возьмите лист бумаги, разделите его на две части. На одну выпишите все свои положительные качества, на другую – отрицательные. Сделали? А теперь обведите все это в кружочек – это ваша индивидуальность, вы – единственный и неповторимый, поймите это, примите и полюбите.

**Планируйте свои действия.** Это значительно полезнее, нежели развязывание пустопорожних дискуссий и погружение в дебри лишенных основания предположений. Заносите в план не только все подстерегающие вас ужасы и несчастья, но и одновременно вырабатывайте альтернативный, позитивный взгляд на ситуацию в целом: в конце концов, самое худшее – маловероятно, а несчастья вовсе не сыплются на нас как из ящика Пандоры.

Продумайте сразу несколько вариантов решения трудностей, дабы неудавшийся один из них не повергал вас в уныние и бездействие. Если говорить об этом на примитивном уровне, то в парк Румянцевых и Паскевичей можно попасть не только по улице Советской. Однако, все же советую продумать и самый худший вариант ситуации, но не ожидая его, а просто, чтобы быть во всеоружии.

Я уверена, что три этих простых правила могут сотворить с вами чудеса. С другой стороны, всегда оказывается гораздо проще разглядеть недостатки любого нового предложения, нежели обнаружить его достоинства. Искренне надеюсь, что Вы не пойдете по этому пути, ибо он логически вытекает из всей той же злополучной «формулы неудачи». Я не предлагаю Вам сразу резко и круто изменить жизнь, но если Вы, бросая курить или начиная худеть, или...или...или, избежите первоначального «не смогу», то это уже будет нашей маленькой победой, которая, однако, будет иметь решающее значение. Я понимаю, что старые привычки не уходят легко, что гораздо легче забраться в мягкую удобную постель вредной привычки, чем выбраться из нее. Но как говорил незабвенный Марк Твен, от плохих привычек надо избавляться постепенно, шаг за шагом спускать их по лестнице.

**Желаю удачи!**

**Дарья КОРОЛЬ,**
**студентка 3-го курса факультета психологии и довузовской подготовки.**

Спорт • Спорт • Спорт

## УПЕРШЫНЮ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

У спартыўнай зале ГДУ упершыню прайшлі асабістыя спаборніцтвы па гіравому спорту на першынство універсітэта, якія арганізаваў і правёў старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту М.Кузянёк.

Прыемна адзначыць, што за ўзнагароды змагалася 30 студэнтаў з 7 факультэтаў. 9 атлетаў упершыню выканалі нарматыў І спартыўнага разраду, 7 – ІІ і 13 – ІІІ.

У вагавых катэгорыях пераможцамі сталі трэцякурснік матэматычнага факультэта Дзмітрый Хадановіч (60 кг), трэцякурснік гістарычнага факультэта Дзмітрый Ткач (65 кг) і Павел Гапановіч (70 кг), першакурснік філфака Максім Плотнікаў (75 кг), а таксама першакурснікі Мікалай Хвацюк (80 кг) з фізічнага, Валерый Булдачоў (90 кг) з геолага-геаграфічнага і Дзмітрый Лукомскі (100 кг) з юрыдычнага факультэтаў.

Студэнты спаборнічалі ў выкананні 24-х кілаграмовай гіры.

## ПЕРАМОЖЦАЎ ВЫЗНАЧЫЛІ ПЛЫЎЦЫ

121 студэнт з 11 факультэтаў прынялі ўдзел у першынстве універсітэта па плаванню. На дыстанцыі 50 м вольным стылем і брасам сярод дзяўчат перамогу святкавала студэнтка юрыдычнага факультэта Вольга Мельнікава. У мужчын на гэтай жа дыстанцыі мацнейшымі былі адпаведна Кірыл Чыж з геолага-геаграфічнага і Аляксандр Врубель з юрыдычнага факультэтаў.

У камандным заліку мацнейшымі аказаліся дзяўчаты факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі. Наступныя месцы занялі адпаведна спартсменкі эканамічнага і філалагічнага факультэтаў. Прызёрамі сярод мужчын сталі адпаведна каманды геолага-геаграфічнага, юрыдычнага і фізічнага факультэтаў.

Спартакіяда універсітэта працягваецца і ўжо набліжаецца да свайго завяршэння.

**В.МАРЧАНКА.**


## ВНИМАНИЮ СТУДЕНТОВ-ЮРИСТОВ!

*Вышли из печати учебники:*
Гражданское право. Ч. 2
**Гражданский процесс. Особенная часть.**
**Таможенное право.**
**Право социального обеспечения.**
Административное право.
Трудовое право.
Общая теория государства и права.
**Приобрести книги можно во всех книжных магазинах и областных книготоргах.**
**В г. Минске звоните: 254-69-87, 254-10-98,**
**приходите:**
**г. Минск, ул. Кальварийская, 62, издательство «Амалфея».**

МИР ЦВЕТОВ – МИР ПРЕКРАСНОГО

# И ИНТЕРЬЕР ОЖИВИТ, И НАСТРОЕНИЕ ПОДНИМЕТ

По данным аукционных продаж в Голландии, диффенбахия является одним из самых популярных комнатных растений. Она является модным украшением служебных кабинетов, офисов, больших комнат, зимних садов.

Относится это растение к семейству ароидных. Название рода дано в честь немецкого ботаника Й.Ф.Диффенбаха (1794-1847). В тропиках Америки произрастает 30 его видов – многолетних корневищных трав, полукустарников высотой более 2-х метров. За полтора века культивирования этих растений садоводами получено огромное число межвидовых гибридов и сортов. Наиболее устойчивыми в комнатных условиях оказались диффенбахия пятнистая и диффенбахия сегуина.



Цветет диффенбахия редко, желтовато-белые початки, окруженные покрывалом, малодекоративны. Красоту растению придают листья – крупные, цельные, овальные или продолговатые, заостренные на верхушке, с матовой или блестящей поверхностью. На них имеется исключительно красивый узор пятен белых, желтых, палевых, изумрудных, причудливо разбросанных по ярко-зеленому основному фону. Высокая декоративность растения позволяет использовать его в одиночку и групповых композициях. Сочетание желто-зеленых тонов листьев оживляет интерьер, делает его элегантным, уютным. Размещают диффенбахию в светлых или слегка затененных местах помещения, притеняют от прямых солнечных лучей, избегают сквозняков и излишне сухого воздуха. В комнатных условиях она растет быстро, но нижние листья постепенно усыхают и растение приобретает вид ложной пальмы. У старых экземпляров срезают и укореняют верхушку и кусочки стебля со спящей почкой.

У диффенбахии сегуина листья более широкие, а в рисунке меньше белых пятен.

В работе по уходу и размножению диффенбахий нужно соблюдать осторожность – все части растения ядовиты. Жгучий сок вызывает сильный ожог слизистых оболочек и кожи. В прошлом в Вест-Индии плантаторы наказывали рабов, заставляя их откусывать куски стебля. Немедленно возникал отек слизистых оболочек и языка, затрудняя речь. Поэтому диффенбахию называли "немая розга". Местное население использовало ее в лечебных целях и как яд против насекомых и грызунов.

Ядовитый сок – защитное приспособление диффенбахий против вредителей и болезней в условиях тропического леса. Это свойство сохраняется и в комнатных условиях. Поэтому в целях предосторожности не рекомендуется использовать диффенбахию в озеленении дошкольных учреждений. После работ с ней нужно тщательно мыть руки. При соблюдении указанных условий это растение всегда будет радовать своим эффектом, солнечным, теплым обликом, особенно когда за окном морозная зима.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

## ІВАНОЎ Юрый Паўлавіч



На 63-м годзе жыцця раптоўна памёр кандыдат геолага-мінералагічных навук, дацэнт Юрый Паўлавіч Іваноў.

Ю.П.Іваноў нарадзіўся ў кастрычніку 1939 г. у г.Бранску ў сям'і рабочага. Пасля заканчэння Кіеўскага геолага-разведачнага тэхнікума працаваў рабочым, памочнікам буравога майстра ў Данбасе. Адслужыўшы ў радах Савецкай Арміі, працягваў вучобу ў Івана-Франкоўскім філіяле Львоўскага політэхнічнага інстытута, сумяшчаў працу тэхніка-геолага ў Рэчыцкай нафта-разведачнай экспедыцыі глыбокага свідравання з завочнай вучобай у Івана-Франкоўскім інстытуце нафты і газу. Атрымаўшы дыплом горнага інжынера-геолага, працаваў на УБР "Рэчыцабурнафта".

У 1974 г. Ю.П.Іваноў закончыў аспірантуру пры кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі ГДУ, і з таго часу яго далейшы жыццёвы шлях быў звязаны з геолага-геаграфічным факультэтам, дзе ён ад асістэнта вырас да дацэнта, загадчыка кафедры, намесніка дэкана па вучэбнай рабоце. Лекцыі, заняткі са студэнтамі ён сумяшчаў з выкананнем важных для народнай гаспадаркі рэспублікі навуковых даследаванняў у галіне гідрагеалогіі, вынікі якіх са значным эканамічным эфектам укараняліся ў практыку.

Ю.П.Іваноў душой хвараў за родны факультэт, быў актыўным удзельнікам яго грамадскага жыцця: з'яўляўся старшынёй прафбюро, ст. куратарам геафака і студэнцкага інтэрната. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам у калектыве, сярод студэнтаў, за добрасумленную працу ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі універсітэта, аблвыканкама, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Самыя лепшыя ўспаміны аб Ю.П.Іванове надоўга захаваюцца ў сэрцах усіх, хто яго ведаў.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**



***На перерывах между занятиями в учебных корпусах наблюдается знакомая картина: на лестничных площадках, в местах общественного пользования повисает сизая табачная дымка. Курение студентов, несмотря на приказ руководства университета о его запрете в стенах ГГУ, продолжается, особенно в корпусах, отдаленных от того же руководства. Нередко можно увидеть с сигаретой в руках и преподавателей. На справедливые замечания тех, кто невольно вынужден дышать сигаретным дымом, курильщики реагируют, в основной своей массе, примерно так: "А где написано, что нельзя курить?", или молча, но с язвительной ухмылкой: мол, курил и курить буду...***

***Стало очевидным, что справиться с этим злом в стенах нашего вуза только изданием соответствующего приказа, о котором многие первокурсники даже не знают (а их среди курящих тоже немало), – невозможно. Словесные замечания, нотации, "стращания" отчислением из университета должного эффекта пока не дают. Тем не менее решить эту проблему смогли в других вузах (в БелГУТе, например, БГУ). Каким образом? Выполнением принятых решений: издали приказ о запрете курения, где указаны конкретные меры наказания за его нарушение, и применили их к тому, кто провинился. Справедливо и другим не повадно.***

***Проблема курения в университете волнует и работников отдела воспитательной работы. Надеемся, что статья, подготовленная его педагогом-психологом и публикуемая ниже, заставит студентов подумать о том, стоит ли так небрежно относиться к собственному здоровью.***

О ВРЕДЕ КУРЕНИЯ

# ЛУЧШЕ НЕ НАЧИНАТЬ!

*Мефистофель, показывая Фаусту табачные листья, говорил: "Полезная травка! Это вам не лопухи какие-нибудь! Кто хоть раз подымит трубкой, тот уж курения не оставит".*

*И действительно, есть в курении что-то дьявольское. Это пристрастие крадет у человека до 15 лет жизни. Тем более в сочетании с неблагоприятной экологической обстановкой у курильщиков чаще развиваются рак, туберкулез, сердечные заболевания, хронический бронхит и т.д. Но большинство подростков, начиная курить, не думают о своем здоровье. А ведь именно в этом возрасте курение сильнейшим образом воздействует на растущий организм.*

Потребность в курении не дана человеку изначально. Она вырабатывается каждым индивидуально. И возникает потребность в кайфе, который, как кажется курильщику, помогает сосредоточиться, заполнить паузы в разговорах, успокоиться.

Почему же подростки, студенты начинают курить?

Потому что еще с младенческого возраста они становятся пассивными курильщиками, если в семье хотя бы один человек курит.

Пассивное курение — беда большинства некурящих людей. Они так же, как и курильщики, подвергаются воздействию этого вида бытовой наркомании. В закрытом помещении при выкуривании пяти сигарет некурящий получает дозу одной сигареты. А когда ему исполняется 13-15 лет, он хочет стать взрослым, поэтому пытается походить на них и берет сигарету. Так делают многие подростки. Другие же присоединяются потому, что не хотят отделяться от сверстников. Причем сейчас курение – привилегия не только юношей. В возрасте 13-15 лет начинают активно курить девушки. А ведь они – будущие матери! Астмы, бронхиты, воспаления легких у детей – результат курения матерей.

Курящие девушки стараются быть привлекательнее и раскованнее с помощью сигареты. Но мужчинам часто не нравится запах сигарет, исходящий от женщины. Это пробуждает отрицательные эмоции. Девушка перестает быть нежной и загадочной, сигарета отождествляет ее с независимостью, мужской силой. Практически все мужчины не хотят иметь курящую подругу, а тем более жену. Исследователи установили, что с молодости курят 90% курящих людей. Это связано со стремлением к независимости, к риску в подростковом, а позже и в студенческом возрасте.

Жизнь кажется бесконечной, и каждый надеется на личное везение. Но именно люди, начавшие курить в 13-15 лет, довольно быстро, в 40-50 лет, пополняют онкологические диспансеры, становятся хилыми людьми с желтой кожей, с раздражающим кашлем и кругами под глазами.

Тем, кто хочет бросить курить и не может этого сделать, можно дать совет – обратитесь к наркологу. Особенно если, перестав курить, он чувствует подавленность и раздражительность, жалуется на тяжесть в сердце, кашель, головокружение, потливость.

Лучше бросить курить сразу. Это сделать довольно легко, при условии, что молодой человек сможет противостоять сверстникам. Если его пригласят покурить, он должен сказать: "Я уже покурил". Продержавшись таким образом месяц, можно сказать друзьям, что он бросил курить. Лучше избавляться от вредной привычки группой или вдвоем. Будет с кем поделиться ощущениями. Девушкам не стоит волноваться об увеличении массы тела. Если они не будут употреблять слишком много сладостей, не будут беспорядочно есть, то не поправятся. Также не следует забывать и о физической активности. Облегчение наступит через месяц-полтора. Попробуйте еще раз, если первая попытка не увенчалась успехом.

Бросивший курить не должен никогда, ни при каких обстоятельствах снова прикасаться к сигарете!!! Даже одна, случайно выкуренная, может явиться толчком к проявлению старой привычки.

Курение провоцирует возникновение аллергических заболеваний (аллергический бронхит, астма, дерматит, ринит). Нервная система у курящих ослаблена, поэтому у них чаще проявляются симптомы неврастении, невралгии и перенесённые заболевания дают осложнения.

Что же привлекает молодёжь к курению?

Это "маленькие радости": курение может временно успокоить при волнении, во время сдачи экзамена, снижает чувство голода (особенно это привлекает девушек), зимой согревает на улице, а летом отгоняет комаров, даёт возможность продемонстрировать самостоятельность или независимость.

ПОМНИТЕ: за любую, пусть даже самую маленькую из этих "радостей" или даже за все вместе взятые, нельзя платить тем, чем расплачивается курильщик, – здоровьем.

Однако не всякий человек может решительно справиться с бытовой наркоманией (курением), чаще силы воли бывает недостаточно. Пока решительность курильщика не достигла нужной для обеспечения успеха силы, ему нужно хотя бы принять меры для ослабления влияния табачных ядов на организм. Надо знать о том, что в холод, на ветру, в дождь резкий перепад температур горячего дыма и вдыхаемого воздуха губительно действует на зубы, слизистую верхних дыхательных путей; сразу после физической нагрузки больше табачного дыма проникает в лёгкие; одну и ту же сигарету нельзя пускать "по кругу" (это увеличивает возможность заражения инфекционными заболеваниями и т.п.). Очень вредно сочетание алкоголя с никотином, курение до еды, натощак и ночью, во время болезни, в жаркую безоблачную погоду на пляже.

И если вы любите себя, уважаете окружающих, заботитесь о своих близких, думаете о будущем, то самое лучшее, что вы можете сделать – это бросить курить! Подумайте, ещё не поздно!

**И.ПЫЛИШЕВА,**
**педагог-психолог отдела воспитательной работы.**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

– філасофіі – ст. выкладчыка;
– крымінальнага права і працэсу – асістэнта (2);
– сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі – заг. кафедры, асістэнта;
– фізвыхавання і спорту – заг. кафедры, выкладчыка;
– аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры – выкладчыка;
– алгебры і геаметрыі – асістэнта;
– рускай літаратуры – асістэнта;
– экалогіі – асістэнта.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты геолага-геаграфічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці намесніка дэкана названага факультэта кандыдата геолага-мінералагічных навук, дацэнта **ІВАНОВА Юрыя Паўлавіча** і выказваюць сваё спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў АГЧ выказвае спачуванне вядучаму інжынеру эксплуатацыйна - тэхнічнага аддзела **КАЛІНКОВУ Уладзіміру Мікалаевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – заўчаснай смерці **БРАТА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 224.
Падпісана да друку 13.05.2002г.